*ТЭМА: Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку ( 7 кл.)*

*МЭТЫ І ЗАДАЧЫ:*

***- садзейнічаць фарміраванню паняцця аб дзеепрыслоўным звароце; выпрацоўваць уменні і навыкі абгрунтоўваць пастаноўку знакаў прыпынку пры дзеепрыслоўным звароце; выяўляць у сказах і тэкстах дзеепрыслоўныя звароты, абгрунтоўваць мэтазгоднасць іх ужывання; садзейнічаць развіццю маўлення; пашыраць слоўнікавы запас мовы вучняў; ствараць на ўроку сітуацыі поспеху, псіхалагічнага камфорту ; выхоўваць самастойнасць, добразычлівыя ўзаемаадносіны паміж вучнямі ; выхоўваць у вучняў патрыятычныя пачуцці.***

*ТЫП УРОКА:* ***урок вывучэння новага матэрыялу***

*МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ:* ***беларуская літаратура***

*АБСТАЛЯВАННЕ:* ***Лазарук, М.А. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларуск. і руск. Мовамі навучання / Г.М. Валочка, С.А.Язерская. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009; карткі з заданнямі, ілюстраваны слоўнік іншамоўных слоў, партрэт Васіля Быкава, кніга “Беларускі народны каляндар” (Мінск: Полымя, 1993), магітафон, касета з запісам (песня “Журоўлі”), беларускі ручнік, свечка.***

*ТЫП УРОКА:* ***камбінаваны***

*ХОД УРОКА*

*І. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ*

***1. Стварэнне на ўроку псіхалагічнага камфорту, добразычлівых узаемаадносін.***

***-- Дзень добры! Мы прамаўляем гэтыя словы па некалькі разоў на дзень, яны сталі звыклым вітаннем, а таму, напэўна, часам не задумваемся над іх сэнсам. А сэнс гэтых слоў глыбокі. Дзеля таго, каб гэтыя словы гучалі штодня, людзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны аддавалі свае жыцці. Дзеля светлага, мірнага дня для нас яны станавіліся пад варожыя кулі, засланялі сабою смерць, якая ішла на нашу Радзіму. І дзякуй ім і Богу, што ўжо амаль 70 гадоў мы маем магчымасць казаць адзін аднаму “Дзень добры!”***

***Давайце прачытаем правілы, якія будуць суправаджаць нашу работу на працягу ўрока.***

**Правілы ветлівасці:** ***1. Захоўваем дысцыпліну.***

***2. Паважаем думку кожнага.***

***3. Помнім, што памыліцца можа кожны.***

***4. Працуем дружна, хутка, якасна.***

***2. Арфаграфічная хвілінка:*** ***А чаго я вам жадаю на ўроку, вы даведаецеся, калі адгадаеце крыжаванку. Заадно замацуеце правапіс слоў. Дапаможа вам у гэтым наш ілюстраваны слоўнік іншамоўных слоў .***

***1. Невялікі кашалёк для грошай (партманэ)***

***2. Прыправа, падліва для стравы (соус)***

***3. Буйная афрыканская птушка атрада бегуноў (страус)***

***4. Электронная вылічальная машына (камп'ютар)***

***5. Металічны знак у выглядзе кружка з рэльефным адбіткам і надпісам для ўзнагароды за асаблівыя заслугі (медаль)***

***6. Паслядоўнае размяшчэнне пасад, званняў, з'яў ад ніжэйшых у парадку іх падпарадкаванасці (іерархія)***

***7. Ваенная або грамадзянская вопратка (мундзір)***

**ПАРТМАНЭ**

**СОУС**

**СТРАУС**

**КАМП'ЮТАР**

**МЕДАЛЬ**

**ІЕРАРХІЯ**

**МУНДЗІР**

***ІІ. ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ***

***1.Франтальнае вуснае апытванне.***

***- Якую форму дзеяслова называюць дзеепрыслоўем?***

***- Назавіце марфалагічныя прыметы дзеепрыслоўя.***

***- Якую ролю выконвае дзеепрыслоўе ў сказе ?***

***2. Графічны дыктант***

***Дома вы паўтаралі правапіс не з деепрыслоўямі. А наколькі сумленна вы гэта зрабілі, нам пакажа графічны дыктант.***

***Не спяшаючыся, непакоячыся, не прачытаўшы, не здзіўляючыся, ненавідзячы, не помнячы, не азіраючыся, не згубіўшы, не ведаючы, не спалохаўшыся.***

***(Узаемаправерка: разам – 2, 5, астатнія – асобна)***

| | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ***Разам*** | | | | | | | | | | |
| ***Асобна*** | | | | | | | | | | |

***-Як пішацца не з дзеепрыслоўямі?***

***III. ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ***

1. ***Хвілінка адкрыцця.***

***Якую сінтаксічную канструкцыю ўтвараюць дзеепрыметнікі разам з залежнымі словамі? Ці могуць такую сінтаксічную канструкцыю ўтвараць дзеепрыслоўі? Як вы лічаце?***

***2.Паведамляецца тэма ўрока. Вучням прапануецца сфармуляваць задачы ўрока.***

***Настаўнік карэкціруе адказы вучняў пры неабходнасці .***

***IV . ВЫВУЧЭННЕ І ЗАМАЦАВАННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ***

1. ***Праца з падручнікам . Знаёмства з матэрыялам на с.68. , запіс схем дзеепрыслоўных зваротаў на дошцы.***

***Замацоўваць атрыманыя веды мы будзем на аснове ўжо знаёмага вам апавядання В.Быкава "Незагойная рана". Давайце ўспомнім, пра што гэты твор.***

2. ***Работа ў парах з тэкстам 1 (карткі ляжаць на партах). Прачытайце выразна тэкст. Вызначце тэму ўрыўка (карціна***

***паўсядзённага жыцця Тэклі ) , стыль маўлення. Патлумачце падкрэсленае ў тэксце слова.***

***Знайсці ў тэксце дзеепрыслоўныя звароты, вызначыць, якім членам сказа яны з'яўляюцца.***

**Тэкст 1**

**Ад ветру і холаду ў старой макрэюць запалыя вочы, яна раз-пораз выпростваецца і, прыставіўшы да чурбана выслізганае тапарышча, ражком хусткі выцірае слёзы. Жанчына вельмі стамілася, а насекла столькі, што не хопіць і разу прапаліць у печы. Спачыўшы з хвіліну, яна зноў прыступае нагой на тую жардзіну і ўзмахвае вышчарбленай сякерай…Тым часам марудна цямнела, далячынь спавілася шэрай смугою, у паветры заснавала надакучлівая восеньская <u>золь.</u> Абудзіўшыся ад задумення, старая сабрала на руку нарыхтаваныя паленцы і, кранууўшы закрутку сенцаў, увайшла ў хату.**

(Золь – непагадзь, сырое, халоднае надвор'е)

**Фізкультхвілінка**

**Той, хто лічыць сябе патрыётам – падыміся!**

**Той, хто ўдзячны зямлі Беларусі – пакланіся!**

**Хто лічыць сябе шчаслівым – усміхніся!**

**Хто да добрых ведаў імкнецца – падцягніся!**

**Хто сябру жадае дабра – прывітайся!**

**І хутчэй да кнігі за парту вяртайся!**

***3.*** **Самастойная работа вучняў з тэкстамі (на картках)**

***Выкананне рознаўзроўневых заданняў.***

1) **Знайсці ў тэксце дзеепрыслоўныя звароты, падкрэсліць іх як члены сказа ( 2 узровень).**

***Нехта ўвайшоў у сенцы, зашкрэбаў рукой па сцяне, шукаючы клямку. Ён! Старая ўзнімаецца на печы, спускаецца і, сцягнуўшы за сабою ватоўку, таропка бразгоча зашчапкай.***

2) **Спішыце сказы, падкрэсліце дзеепрыслоўныя звароты як члены сказа, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку(3 узровень)**

***Тэкля ўсё сядзела, склаўшы на каленях рукі . У гэты вечар яна не паліла ў грубцы і не засвяціла лямпы. Жанчына ўзлезла на печ і , накрыўшыся світкай, скурчылася на ўскрайку. Яна не заснула, а ляжала так, не заплюшчваючы вачэй .***

**Для чаго аўтар так часта выкарыстоўвае дзеепрыслоўі? (*дапамагаюць раскрыць душэўныя перажыванні і пакуты старой маці) .***

**3) Падабраць з матэрыялу для даведак неабходныя дзеепрыслоўныя звароты.Запісаць , ставячы неабходныя знакі прыпынку. Падкрэсліць дзеепрыслоўныя звароты як члены сказа.(4 узровень)**

***Старая ўсё ўглядалася ў іх – пільна і доўга_____________________________ а яны_______________________________________________________________ так і мінулі вёску.***
***Яна________________________________________________узлезла на пагорак, але дарога была пустая.***

***Словы для даведак: бесклапотна гутарачы аб нечымі перасмейваючыся, захлынаючыся ад нецярплівасці, захліпаючыся ад стомы і хвалявання.***

4. ***Праца па варыянтах. Запісаць сказы, раскрыць дужкі, расставіць знакі прыпынку, зрабіць сінтаксічны разбор сказаў. (Двое вучняў працуюць каля дошкі)***

*1 варыянт*

*Тэкля сядзела (не) кратаючыся схіліўшы ў задуменні голаў.*

*2 варыянт*

*(Не) зачыніўшы нават сенцаў старая хутка пайшла па дарозе.*

5. *Паведамленне пра Пакровы.*

   *А цяпер успомніце, калі ласка, на якое старажытнае свята нарадзіўся Васілька. А што вы ведаеце пра гэта свята? Звернемся да беларускага народнага календара*

***Пакровы – старажытнае свята славян. Заканчваліся восеньскія, надыходзілі зімовыя работы. У гэты час вазілі дровы, пераводзілі жывёліну на стойлавае ўтрыманне. Гэта была пара вясковых вяселляў. У народзе гаварылі: "Які Пакроў па надвор'і – такой будзе і зіма".***

6. ***Індывідуальнае творчае заданне . Запісаць фразеалагізмы, растлумачыць іх значэнне наступных : прапусціўшы міма вушэй, як вады ў рот набраўшы, не пакладаючы рук.***

   ***Якія з гэтых фразеалагізмаў можна суадесці з вашай працай на ўроку?***

**Скласці з адным з іх сказ, падкрэсліць дзеепрыслоўны зварот, выражаны фразеалагізмам.**

**Каментарый настаўніка*: У сказе дзеепрыслоўі, якія ўваходзяць у склад фразеалагізмаў, на пісьме коскамі не выдзяляюцца.***

7. ***Праверачны тэст(самаправерка).***

   ***Вучням прапануецца выканаць тэставае заданне і вызначыць, наколькі імі засвоены матэрыял.***

- ***Абазначце сказы, у якіх  дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты трэба выдзеліць коскамі.***

1. ***Яна захліпаючыся ад стомы і хвалявання  узлезла на пагорак, але дарога была пустая.***
2. ***Маці ўжо гады тры таму назад перабралася з вёскі, але па-ранейшаму не можа сядзець склаўшы рукі.***
3. ***Маці  млеючы ад жаху хапаецца за сына  прабуючы ўзняць .***
4. ***Старая ўзнімаецца на печы, спускаецца і сцягнуўшы за сабою ватоўку таропка бразгоча зашчапкай.***

***(1, 3, 4)***

**V. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ**

***У гады Вялікай Айчыннай вайны салдаты з фронту прысылалі сваім родным паштоўкі ў выглядзе трохкутнікаў. Прапаную вам дома напісаць пісьмо маці, выкарыстаўшы дзеепрыслоў і дзеепрыслоўныя звароты.***

- ***Напрыканцы ўрока ў выкананні двух вучняў гучыць верш В.Зуёнка     "З вайны сустрэлі мацяркі сыноў…"***

***З вайны сустрэлі мацяркі сыноў***

***І выглядалі-радзілі нявестак.***

***А сын яе дадому не прыйшоў.***

***Прыйшло кароткае:***

***"Прапаў без вестак…"***

***Сябры пасмуткавалі, землякі,***

***Слязу змахнула ўпотайкі дзяўчына:***

***Не вернецца…Знаць лёс яе такі…***

***Ды толькі сын для маці не загінуў.***

*Знаходзіць маці тысячы прычын ,*

*Чаму так доўга сын яе ў дарозе,*

*Чаму не йдзе разгладзіць ёй маршчын*

*І высушыць на родным твары слёзы.*

*Яна між рэчаў самых дарагіх*

*Кашулі сына беражна хавае,*

*Святочным днём падоўгу каля іх*

*Стаіць,*

*гамоніць з імі,*

*плача і ўздыхае…*

*І ёй успамінаецца тады,*

*Як сын казаў: "Вярнуся, не загіну,*

*Чакай мяне…Чакай!..."*

*Ідуць гады,*

*І кожны дзень чакае маці сына.*

**Настаўнік.** *Больш за шэсць тысяч помнікаў на зямлі Беларусі ўслаўляюць векапомны подзвіг народа, здзейснены за гады Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з іх – помнік "Маці-патрыётка", які ўвасабляе драматычны лёс адной з многіх маці, што аддала сваіх сыноў на абарону Радзімы і не прычакала іх з поля бітвы (фотаздымак на дошцы).*

*Манумент знаходзіцца ў горадзе Жодзіна. Ён прысвечаны Анастасіі Фамінічне Купрыянавай і яе пяці сынам, што не вярнуліся з вайны. Адзін з сыноў – Герой Савецкага Саюзу Пётр Купрыянаў – здзейсніў бессмяротны подзвіг – закрыў сваім целам амбразуру дзота ворага.*

***Кожнага трэцяга свайго сына ці дачкі не дачакалася маці-Беларусь з Вялікай Айчыннай вайны. Мы памятаем тых, хто сёння падарыў нам мірнае неба над галавою і ганарымся тым, што мы, беларусы, народ з гераічнай гісторыяй, што ў нас ёсць такі вялікі пісьменнік, як Васіль Уладзіміравіч Быкаў.***

**Гучыць песня “Жураўлі” Яна Фрэнкеля на словы Расула Гамзатава. На стале запальваецца свечка. Усім вучням прапануецца ўстаць і яшчэ раз успомніць усіх маці-пакутніц, што не прычакалі з поля бою сваіх дзяцей, усіх, хто не дажыў да светлага дня Перамогі.**

**- *Мне хацелася б, каб гэты ўрок не прайшоў для вас бясследна, каб запаліў ён у вашых сэрцах агеньчык дабрыні і спагады, які далей будзе асвятляць ваш шлях і саграваць тых, хто побач з вамі. Засланяйце ж гэты агеньчык ад вайны і жыццёвых нягод і сцюж!***

***У вас на партах ляжаць папяровыя кветкі. Прымацуйеце іх да фотаздымка помніка “Маці-патрыётка”. Гэта будзе знак вашай ўдзячнасці за ваша шчаслівае дзяцінства.***

**VI. РЭФЛЕКСІЯ**

- ***Што вы сёння засвоілі на ўроку?***
- ***Ці спатрэбяцца вам гэтыя веды ў жыцці?***
- ***Якія віды работ вам спадабаліся больш за іншыя?***
- ***Каго б вам хацелася сёння пахваліць?***

***Шчыра дзякую, сябры мае, за працу. Вы заслугоўваеце сёння найлепшых балаў.***